


GP
gpress.info

# ДАЙДЖЭСТ

## АСВЯТЛЕННЯ ТЭМАТЫКІ ЛГБТК+ У БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯ

*04–06.2023*

II квартал 2023 года вызначыўся шумам вакол ідэі забароны «ЛГБТ-прапаганды» на ўзор РФ.

Варта адзначыць, што напярэдадні Лукашэнка, выказваючыся пра геяў, адзначыў: «...Ну давайце мы гэтым мужыкам будзем забараняць кувыркацца з іншымі мужыкамі, на да чаго гэта прывядзе? Ні да чога. Тым больш праблемаў нам не ствараюць, працуюць добра».

Адсюль побач з выказваннямі праўладных актывістаў і прапагандыстаў з'явіліся і цалкам адназначныя заявы дэпутатаў: «Дэпутаты лічаць, што пакуль у Беларусі і без закона працуюць больш эфектыўна».

Міністарка працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч выказалася ў тым самым духу: «Разглядаць чайлдфры, ЛГБТ як тэндэнцыю ў беларускім грамадстве не бачу падставаў».

Не збіраецца ўносіць прапановы пра забарону «прапаганды ЛГБТ» і той, хто задаў пытанне Лукашэнку – Алег Гайдукевіч. Вось яго цытата: «Я пачуў галоўнае для сябе – прапаганды нетрадыцыйных каштоўнасцяў, таго, што разбурае сям'ю і нашыя падваліны, у Беларусі не будзе, і большага мне не трэба. Я ўбачыў дакладную пазіцыю кіраўніка дзяржавы».

Адзначым, што апошнюю прапанову ў цытаце магчыма трактаваць як з пазіцы «прапаганды ЛГБТ у нас няма і гэтага мне дастаткова», гэтак і «забароны прапаганды ў нас не будзе і гэта мяне задавальняе».

У сярэдзіне красавіка 2023 года, абмяркоўваючы чарговыя папраўкі ў закон аб СМІ, беларускія дэпутаты прапанавалі дадаць яго забаронай на «прапаганду ЛГБТК+». Кіраўнік Мінінфарма ў адказ на гэту прапанову адзначыў, што ведамствам ужо прынятыя «дастатковыя захады для таго, каб распаўсюд такой прадукцыі ў нашай краіне быў абмежаваны».

І дадаў, што, на ягоную думку, да распрацоўкі такога законапраекта неабходна «падысці комплексна, і асноўную ролю павінны выканаць заканадаўцы, сцягнуўшы да сябе разнастайныя ведамствы: і Мінадукацыі, і Міністэрства аховы здароўя, і Мініфарм, і МУС, каб гэта быў комплексны і шырокі прававы акт».

Акрамя гэтага, міністр інфармацыі паведаміў, што ведамствам былі разасланыя 500 лістоў-папярэджанняў усім выдаўцам і кнігарням: калі падобную літаратуру ў продажы знойдуць, то «будуць прымацца пэўныя захады адміністрацыйнага ўздзеяння».

І вось 19 чэрвеня сталася вядомым, што сілавікі прапануюць увесці «адміністрацыйную адказнасць за прапаганду нетрадыцыйных сэксуальных адносінаў, змены полу, педафіліі ды чайлдфры». Пра ўсе гэтыя ініцыятывы прадстаўнікі Генпракуратуры распавялі адначасова з новаўвядзеннямі па абароне дзяцей ад сэксуальнага гвалту і эксплуатацыі.

Увесці адміністрацыйную адказнасць за прапаганду «нетрадыцыйных сэксуальных адносінаў» прапанавалі ў Генпракуратуры. Ідэю падтрымаў Аляксандр Лукашэнка. Пра гэта распавялі ў прэсавай службе наглядната ведамства.

Станоўчым мы лічым з'яўленне ў эфіры незалежных медыяў шэрагу матэрыялаў, якія крытычна падыходзяць да рэплікаў праўладных спікераў. Незалежныя СМІ аналізуюць падобныя выказванні і пісьменна дэзавуіруюць іх: «Дэпутат заявіў, што людзі не глядзяць фільмы ЛГБТ-тэматыкі. А на самай праве цудоўна глядзяць».

Процівагай праўладнай прапагандзе сталася з'яўленне праграмы Gender Gap на Еўрарадыё. У эфіры доктарка навук Ірына Сідорская разглядае гендарную павестку і агучвае навукова абгрунтаваныя доказы, якія разбураюць дзяржпрапаганду:

«Чайлд-фры і ЛГБТ знішчаюць нацыю? У чым не мае рацыі Лукашэнка: Gender Gap».
«Цяпер вы пра правы жанчын, а потым гей-шлюбы падсунеце! - абмяркоўваем».

*Рэдакцыя GayPress*

Падпісвайцеся на наш Telegram-канал!



## Беларуская калона на ЛГБТ-прайдзе ў Варшаве: калі задавальненне – гэта ўжо палітыка

ЛГБТК+ актывістка Віка Біран: “Свой тыднёвы водпуск я вырашыла правесці ў Варшаве на фестывалі постпорна. Пра яго расказваць не буду, не спадзявайцеся - гэта тэма для іншага медыя. Раскажу іншае, бо ў гэтыя ж даты па шчаслівым збегу абствінаў у горадзе быў таксама заяўлены прайд-парад.

https://reform.by/belaruskaja-kolonna-na-lgbt-prajde-v-varshave-kogda-udovolstvie-jeto-uzhe-politika






## Доўгая дарога да той краіны, у якой захочацца застацца

17 траўня — Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй, якая ў цяперашняй Беларусі набыла сваю крайнюю, самую вычварную форму.

https://novychas.online/hramadstva/sztosci-cikavae

## «Цяпер вы пра правы жанчынаў, а потым гей-шлюбы падкінеце» — абмяркоўваем

У сённяшнім выпуску праграмы Gender Gap разважаем пра паліткарэктнасць і пра тое, якія дзіўныя формы яна прымае.

Абмяркуем распаўсюджаны пункт гледжання: вось вы зараз аб правах жанчын разважаеце, а скончыцца гэта дазволам на гей-шлюбы, ЛГБТ-прапагандай і іншай «лухтой».

https://euroradio.fm/ru/teper-vy-o-pravakh-zhenschin-posle-gey-braki-podsunete-obsuzhdaem

## Чайлд-фры і ЛГБТ знішчаюць нацыю? У чым не мае рацыі Лукашэнка: Gender Gap

«Лукашэнка зноў лезе ў асабістае жыццё беларусаў. Цяпер ён хоча забараніць адносіны чайлд-фры, калі ў сем'ях прынцыпова не заводзяць дзяцей. Маўляў, Беларусі "патрэбныя людзі".

Яшчэ некалькі скандальных выказванняў датычылася гомасэксуалаў. З аднаго боку — «нам гэтага не трэба» і «яшчэ ніводзін мужчына не нарадзіў». З іншага: хі-хі, ха-ха, «дай Божа не-геям так працаваць, як працуюць геі ў нас! А самыя вялікія чыноўнікі-геі — увогуле залатыя людзі».

Абмяркуем усё гэта ў свежым выпуску праграмы Gender Gap з даследчыцай Ірынай Сідорскай. Пагаворым аб традыцыйнай і сучаснай сем'ях і аб розных мадэлях сем'яў. А таксама пра тое, як Мінск падстройвае сямейную палітыку пад расійскія нарытывы».

https://euroradio.fm/ru/chayld-fri-i-lgbt-unichtozhayut-naciyu-v-chem-neprav-lukashenko-gender-gap



Дзіўное вясельле.

Ці чулі навіну? Вясельле ж у Вільні хутка будзе!

Вось, падумаеце, зьдзівіў! Вільня-ж табе ня вёска якая, там кожны дзень можа іх з дзесяць бывае!

А вы думаеце якое вясельле, такое звычайнае — хлапец з дзяўчынкай?

Га, калі гэтак дык я і пальцам ня крануў-бы, а ня то яшчэ чарніла дарма псаваць! Вось у тым тут і справа, што яно гэтае вясельле, нейкае дзіўнае, нябывалае!

Толар жа-ж з Пранукем жэняцца!!

Мужчына з мужчынам?!

Але, выпадае гэтак!

— Хлусьня — скажэце—гэта-ж ня чуваная рэч! — Ня дзівецеся, браткі, цяпера-ча такія часы, што як раз тое аб чым чалавек і не падумае, і навет у-ва сне ня ўбачыць — раптам маеш вось цы! Ці мы думалі, што седзячы на вёсцы будзем калісь чуць,

## «Дзіўнае вяселле». Як беларусы ў 1928 годзе гей-шлюбам палохалі

Дзевяноста пяць гадоў таму — 4 ліпеня 1928 года — у віленскай газеце «Сцяг Працы», якую выдавалі беларускія левыя, было надрукавана апавяданне «Дзіўнае вяселле» пад псеўданімам П. Асака. Пад гэтым псеўданімам друкаваўся больш вядомы Пётра Мятла (1890–1936), які меў яшчэ адзін псеўданім — П.Чабор. У кароткім аповедзе беларускі аўтар уявіў, «як мужчына з мужчынам жэніцца», а ўрэшце, і дзіцё заводзяць.

https://novychas.online/kultura/jak-belarusy-u-1928-hodze-hej-szljubam-palohali



## "Яны хочуць зрабіць з нас частку Расіі". Цяпер дакладна: "прапаганда нетрадыцыйных сэксуальных адносін, змены полу і чайлдфры" ў Беларусі – па-за законам

Вельмі дзіўнае і ў той жа час вельмі паказальнае для беларускіх уладаў тэматычнае аб'яднанне атрымалася: педафілы, сэксуальны гвалт – і прапаганда ЛГБТК+, змена полу і чайлдфры.

https://citydog.io/post/zapret-propagandy/

https://news.zerkalo.io/life/41709.html




## Беларусь па талерантнасці да ЛГБТ прыкладна на ўзроўні з Польшчай

Рэйтынг ILGA-Europe змясціў Беларусь у пяцёрку самых неталерантных да сэкс-меншасцяў краін Еўропы.

Беларусь у рэйтынгу 2023 года па ўзроўні роўнасці для ЛГБТ+ набрала 12 адсоткаў са 100 і заняла 45 месца з 49 краін Еўропы. У рэтынгу 0% азначае грубыя парушэньні правоў чалавека, а 100% азначае поўную роўнасьць ЛГБТ+ людзей.

https://thinktanks.by/publication/2023/05/12/belarus-po-tolerantnosti-k-lgbt-primerno-na-urovne-s-polshey.html

## Мінінфарм РБ абараняе расійскі рынак ад ЛГБТК-прадукцыі з Беларусі

Мінінфармацыі Беларусі папярэджвае выдаўцоў, каб яны не парушалі новы расейскі закон аб "прапагандзе ЛГБТ". Адпаведны ліст за подпісам намесніка міністра інфармацыі Ігара Бузоўскага публікуе "Салідарнасць".

https://euroradio.fm/ru/mininform-rb-zaschischaet-rossiyskiy-rynok-ot-lgbtk-produkcii-iz-belarusi

## Забароненыя кнігі ў Беларусі: экстрэмізм, «няправільнае» каханне і «небяспечная» гісторыя

«Ёсць і больш нефармальныя віды забарон. Кнігу могуць негалосна забараніць распаўсюджваць праз дзяржаўныя кнігарні, могуць і націснуць на прыватныя, каб яны прыбралі непажаданую кнігу з паліц. Такое «тэлефоннае права» часта спрацоўвае пасля звароту ў мясцовыя органы праўладных актывістаў кшталту Вольгі Бондаравай. Яна часта знаходзіць у кнігах «прапаганду ЛГБТ+» альбо «нацызм».»

https://ru.hrodna.life/articles/zapreshhennye-knigi-belarusi/

## Беларускага актывіста Валянціна Цішко дэпартавалі з Украіны

Беларускага актывіста Валянціна Цішко дэпартавалі з Украіны, зараз беларус знаходзіцца ў Польшчы. Пра гэта ён распавёў «Медыязоне».

Валянцін Цішко нарадзіўся ў Маладзечна. У Беларусі быў раённым каардынатарам руху «За свабоду». Цішко – адкрыты гей і іерадыякан Грэчаскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

*P.S. Валянцін Цішко вярнуўся ва Украіну (заўв. Gpress.info)*

https://mediazona.by/news/2023/05/03/deportation




## “Незразумела, куды саджаць, давайце расстраляем»: як у Беларусі цкуюць ЛГБТК+(18+)

У беларускіх месцах зняволення і часовага ўтрымання працягваюць катаваць людзей. Адна з груп, якая аказваецца пад вялікай рызыкай – ЛГБТК+ ці проста людзі, якія выглядаюць “не так, як усе”. Сілавікі надаюць ім "асаблівую ўвагу" ў выглядзе абраз, зняваг, збіванняў і згвалтаванняў.

https://euroradio.fm/ru/neponyatno-kuda-sazhat-davayte-rasstrelyaem-kak-v-belarusi-travyat-lgbtk-18




## Прапаганда ЛГБТ і забарона «парылак». Кіраўнік Маладзёвага парламента Беларусі распавёў, якія пытанні хвалюють маладых беларусаў

«…Трэба ўзмацніць адказнасць за распаўсюджванне наркотыкаў, увесці адказнасць за скажэнне гістарычных фактаў і за прапаганду ЛГБТ культуры (калі можна назваць гэта культурай)», – распавёў старшыня Моладзевага парламента.

https://news.zerkalo.io/life/42554.html?c

## У Мінску напалі на дзяўчыну-трансгендара са сцяжкамі Украіны і ЛГБТ+. Пасля гэтага яна знікла, а праз некалькі дзён знайшлася на «соднях»

У Мінску некалькі дзён таму напалі на дзяўчыну-трансгендэра, якая гуляла па горадзе з заплечнікам, упрыгожаным сцяжкамі Украіны і ЛГБТ+. Пасля гэтага яна перастала выходзіць на сувязь і не з'яўлялася дома. Высветлілася, што яе прыгаварылі да 15 содняў арышту за "распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў", паведамілі ў ініцыятыве Tg House.

https://news.zerkalo.io/life/41318.html?c



## Вольга Бондарава: з дарослых «ворагаў» пераключылася на дзяцей. У доўгаваласым хлопчыку, які заспяваў на канцэрце, яна ўбачыла «прапаганду ЛГБТ»

Вольга Бондарава знайшла сабе новы занятак: яна напісала данос на вучня мінскай школы мастацтваў, які выступіў на арганізаваным камуністамі канцэрце 22 красавіка. Гарадзенку настолькі абурыў «жаноцкі» вобраз хлопчыка, што яна абвінаваціла яго ні многа ні мала ў «пагрозе нацыянальнай бяспецы Беларусі».

https://news.zerkalo.io/life/38208.html?c




## Менчук выявіў Губку Боба на плакаце сацыяльнай рэкламы і абурыўся прапагандай "педэрастыі". А вы гэта ўсё бачыце?

Падпалкоўнік унутраных войскаў у адстаўцы Аляксандр Плавінскі знайшоў у Мінску беларускамоўную сацыяльную рэкламу і абурыўся Губкам Бобам, якога ён залічвае да «педэрастаў». Аднак ні Губкі Боба, ні "педэрастаў" на плакаце няма, там толькі тры геаметрычныя фігуры.

https://news.zerkalo.io/cellar/41767.html?c

## Хімічная кастрацыя для адводу вачэй

Аказалася, што ў барацьбе з педафіліяй у Беларусі таксама свой унікальны шлях. Яшчэ дзевяць гадоў таму МУС было супраць хімічнай кастрацыі педафілаў і спасылалася на медыкаў, якія ацэньвалі гэтую працэдуру як неэфектыўную для прафілактыкі сэксуальнага гвалту, а цяпер Генеральная пракуратура Беларусі абвяшчае, што прымусовай хімічнай кастрацыі ў Беларусі — быць.

https://www.svaboda.org/a/32466088.html

## Дэпутат заявіў, што людзі не глядзяць фільмы ЛГБТ-тэматыкі. А насамрэч цудоўна глядзяць

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар Завалей мяркуе, што зараз цяжка спыніць «прапаганду ЛГБТ», бо працуе сусветная кінаіндустрыя, дзе дэманструюць падобныя адносіны. Аднак, па яго словах, рэйтынгі падобных фільмаў нізкія.
Мы вырашылі праверыць.

https://news.zerkalo.io/cellar/39306.html?c

## Эксклюзіўнае інтэрв'ю міністаркі працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірыны Касцевіч для «СБ. Беларусь сёння»

«Разглядаць чайлдфры, ЛГБТ як тэндэнцыю ў беларускім грамадстве не бачу падстаў. Паводле звестак нацыянальнага апытання «Каштоўнасці насельніцтва Беларусі», большасць жыхароў краіны лічаць, што нічога не можа быць важней за мацярынства і бацькоўства, а сярэднестатыстычны беларус марыць пра сям'ю з двума-трыма дзецьмі.».

https://www.sb.by/articles/slagaemye-schastya.html

## Дэ-факта Украіна змагаецца за ЛГБТ – Дзермант

У эфіры праграмы "Аб'ектыўна" палітолаг заявіў, што ва Украіне ўздымуць ЛГБТ-сцяг.

Беларускі палітолаг Аляксей Дзермант заявіў у эфіры праграмы «Аб'ектыўна», што пад ідэямі абароны краіны хаваюцца ЛГБТ-каштоўнасці, Украіна ў любым выпадку ў гэтай вайне прайграе, а ў канцы яе проста зліюць.

https://ont.by/news/po-faktu-ukraina-srazhaetsya-za-lgbt-dzermant

## Шматдзетная маці: афішаваць і прапагандаваць ЛГБТ-каштоўнасці ў беларускім грамадстве недапушчальна

Афішаваць і прапагандаваць ЛГБТ-каштоўнасці ў беларускім грамадстве недапушчальна. Такой думкай падзялілася начальнік упраўлення персаналу і ідэалагічнай работы ААТ "УКГ "Бабруйскаграмаш" Марына Варапай, каментуючы Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.

https://www.belta.by/regions/view/mnogodetnaja-mama-afishirovat-i-propagandirovat-lgbt-tsennosti-v-belorusskom-obschestve-nedopustimo-559261-2023/



## Краіны аб'ядноўваюцца: запушчаная міжнародная праграма па абароне сямейных каштоўнасцяў

«Запыт на абарону традыцыйных сямейных каштоўнасцяў у свеце з кожным годам расце. 16 адсоткаў еўрапейцаў ад 14 да 20 гадоў адносяць сябе да ЛГБТ. У некаторых краінах прапаганда ЛГБТ прыняла татальны абарот — адчыняюцца дзіцячыя сады, праводзяцца майстар-класы па змене полу, для дзяцей арганізуюць сустрэчы з трансгендэрамі, узводзяцца цэлыя жылыя комплексы для ЛГБТ-сем'яў. Кожны пяты малады амерыканец уступае ў ЛГБТ-супольнасць».

https://www.sb.by/articles/druzhnyy-otvet-razrushitelnym-trendam.html




## Украінскіх дзяцей усынаўляюць ЛГБТ-сем'і – распавяла польская праваабаронца

Еўразвяз крадзе дзяцей ва ўкраінскіх бежанцаў, а таксама іншых перасяленцаў, якія з'яўляюцца сацыяльна неабароненай катэгорыяй грамадзян у гэтых краінах. Затым гэтых дзяцей усынаўляюць гомасэксуальныя пары, некаторыя з іх знікаюць без вестак. І ёсць падазрэнне, што іх выкарыстоўваюць як донараў органаў. Пра ўсё гэта ў праграме "Гэта іншае" расказала польская праваабаронца.

https://www.tvr.by/news/obshchestvo/ukrainskikh_detey_usynovlyayut_lgbt_semi_rasskazala_polskaya_pravozashchitnitsa/




## *Пра раман М. Горкага «Адзін з бацькоў, хто нараджае», або Спыніце Зямлю, я сыду!*

Акрамя іншага, там прапануюць упісаць тэму гомасэксуалізму ў школьную праграму аб халакосце, а таксама распрацавана праграма ўключэння сэксуальнасці ў курс па сусветнай гісторыі: "Ад Лесбаса да Стоўнвалла", выдаюцца кнігі накшталт "ЛГБТізацыя пачатковай адукацыі і прадухіленне забабонаў" і, нарэшце, прапануецца так званая бяспечная і інклюзіўная супольнасць у пачатковых школах, дзе інтэграцыі праблем ЛГБТ-супольнасці даецца «навуковае» абгрунтаванне.

https://lidanews.by/news/life/29131news.html



## *Перцаў: да распрацоўкі законапраекта аб забароне прапаганды ЛГБТ трэба падысці комплексна*

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, міністр інфармацыі Уладзімір Перцаў распавёў, што міністэрства інфармацыі прадпрымае захады для абмежавання распаўсюду інфармацыі, якая прапагандуе ЛГБТ.

https://www.sb.by/articles/pertsov-k-razrabotke-zakonoproekta-o-zaprete-propagandy-lgbt-nuzhno-podoyti-kompleksno.html

https://www.tvr.by/news/obshchestvo/pertsov_belarus_effektivno_boretsya_s_propagandoy_netraditsionnykh_tsennostey/




## *Гайдукевич пра ЛГБТ: я ўбачыў дакладную пазіцыю кіраўніка дзяржавы*

«Я пачуў галоўнае для сябе – прапаганды нетрадыцыйных каштоўнасцяў, таго, што разбурае сям'ю і нашыя падваліны, у Беларусі не будзе, і большага мне не трэба. Я ўбачыў дакладную пазіцыю кіраўніка дзяржавы».

https://sputnik.by/20230404/gaydukevich-ob-lgbt-ya-uvidel-chetkuyu-pozitsiyu-glavy-gosudarstva-1073983214.html

## *Забарону на прапаганду ЛГБТ прапануюць увесці ў Беларусі*

Дэпутаты мяркуюць, што пакуль у Беларусі і без закона працуюць больш эфектыўна, чым у Расіі, дзе ўжо дзейнічае адпаведнае заканадаўства.

https://tochka.by/articles/policy/zapret_na_propagandu_lgbt_predlagayut_vvesti_v_belarusi/

https://sputnik.by/20230418/deputaty-predlozhili-dopolnit-zakon-o-smi-zapretom-na-propagandu-lgbt--1074511650.html

https://smartpress.by/news/41916/



## «Экстрэмісцкіх падпісак маю». Гамельчукі дапамаглі затрымаць 8 асобаў з інтэрнэт-«дэструктыўшчыкаў»

«Сярод найбольш непрымальных маніпуляцый: апраўданне фашызму і тэрарыстычных актаў; папулярызацыя ЛГБТ і разбурэнне інстытута традыцыйнай сям'і, ачарненне праваслаўя; распальванне нянавісці па нацыянальнай прыкмеце; лабіраванне санкцый, перадача інфармацыі заходнім спецслужбам; змаўчанні, падмена паняццяў, гістарычных фактаў і адкрытая хлусня аб сітуацыі ва Украіне.»

https://progomel.by/society/politics/2023/04/918501.html




## Трансгендэрная ідэалогія – адзін са спосабаў знішчэння чалавецтва

«Так, сёння трэба казаць не пра «асобныя праявы», а пра наяўную ідэалогію па экспансіі трансгендэрнасці ва ўсіх заходніх і залежных ад Захаду краінах. Мы бачым, што гэты працэс ідзе са значным паскарэннем, набываючы ўсё больш агрэсіўны характар».

https://mlyn.by/17042023/transgendernaya-ideologiya-odin-iz-sposobov-unichtozheniya-chelovechestva/

## Баец з палка Каліноўскага прызнаўся, што ён гей і такіх у іх шмат

Валерый Водзін, 23-гадовы беларус, прызнаўся ў ліставанні добрай знаёмай Вікторыі Волчак, што ён нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі. Такія інтымныя падрабязнасці з жыцця палка сталі вядомыя дзякуючы спецрасследаванню АНТ "Забойная пасылка".

https://ont.by/news/boec-iz-polka-kalinovskogo-priznalsya-chto-on-gej-i-takih-u-nih-mnogo

## Палітычны постскрыптум беларускай гісторыі

Ці ж патрэбны нашай краіне еўрапейскі выбар, да якога імкнецца пэўная частка беларускага грамадства і за які нібы змагаліся «беларускія» паўстанцы 1863-1864 гадоў? Ці гатовыя беларусы да ладу жыцця ў Новым заходнім свеце: «Свабода» там ператварылася ў заслону для дыктатуры і таталітарызму ўладарных элітаў у адносінах да іншадумцаў. Штодзённасцю быцця краін Захаду, у тым ліку Еўропы, стала: разбурэнне традыцыйных чалавечых каштоўнасцяў і замена іх ідэямі ЛГБТ+ (лесбіянкі, геі, бісэксуалы, трансгендэры, а агульная колькасць гендэраў ужо набліжаецца да 300), знішчэнне дзяржаўных межаў і стварэнне агульнасусветнай прасторы на чале з транснацыянальнымі карпарацыямі. Класічныя правы чалавека адменены, а замест іх нястрымная прапаганда абортаў і непрыманне сям'і, як сацыяльнай ячэйкі грамадства і чалавечага роду.

https://mnsvu.org/biblioteka/kadetskaya-proza/politicheskij-postkriptum-belorusskoj-istorii/

# Запрашаем на Gay Press

*https://gpress.info*

YouTube

Instagram

TikTok

ВКонтакте

Telegram

Яндекс.Дзен

Facebook

Twitter

E-mail: gaypresseu@gmail.com

GP

gpress.info